УДК 94:7(476)“1918/1939”

В. У. Коваль, ст. выкл., канд. гіст. навук
(БДТУ, г. Мінск)

# СТАНАЎЛЕННЕ ТЭАТРАЛЬНАГА МАСТАЦТВА Ў АСЯРОДКУ БЕЛАРУСКАЙ ДЫЯСПАРЫ (1918–1939)

Тэатральнае мастацтва беларускага замежжа пачынае развівацца ў міжваенны час. Культурнымі асяродкамі беларускай дыяспары сталі Латвія і Чэхаславакія ў краінах Еўропы, вылучаюцца таксама эміграцыйныя цэнтры ў ЗША, Канадзе, Аргенціне і Бразіліі. Адметнай рысай дзейнасці беларусаў у Латвіі і Чэхаславакіі стала актыўнасць там прадстаўнікоў палітычнай беларускай эміграцыі.

З 1921 г. у Латвіі актыўна пачалі ствараецца вандроўныя беларускія трупы, дзе акцёрамі станавіліся вучні і настаўнікі беларускіх школ і гімназій, звычайныя сяляне і працоўныя. У пачатку 1920-ых гадоў аматарскія тэатры з’явіліся не толькі ў Рызе і Дзвінску, але і ў розных латышскіх вёсках, дзе кампакта пражывала беларускае насельніцтва.

Найбольш вядомай і прэстыжнай беларускай сярэдняй навучальнай установай у Латвіі стала дзяржаўная гімназія ў Дзвінску. Драматычны гурток у гімназіі ўзначальвала Паўліна Мядзёлка. Рэпертуар беларускага тэатра Дзвінскай дзяржаўнай гімназіі быў дастаткова багаты. Трупа ставіла не толькі беларускія п’есы, але і драматычныя творы замежных аўтараў, якія выкладчыкі ўстановы перакладалі на беларускую мову.Люцінская беларуская гімназія была адчынена аднвчасова з Дзвінскай, пачала сваю працу з 1922–1923 навучальнага года. Гімназія мела ўласны тэатральны гурток, свой аматарскі тэатр і хор. Рэжысёрам навучальнай установы і кіраўніком тэатральнага гуртка стаў настаўнік гімназіі С. Казека.

З пачатку 1920-ых гадоў у Латвіі пачалі ствараецца вандроўныя беларускія трупы, у якіх свае артыстычныя здольнасці дэманстравалі звычайныя сяляне. Дапамагалі ў пастаноўках аматарам беларускія настаўнікі. Самым вядомым і папулярным стаў аматарскі тэатр у вёсцы Шнёкава Прыдруйскай гміны. Рэжысёрам тэатра быў таленавіты вясковы настаўнік М. Талерка.

Тэатральнае мастацтва напаўняла культурнае жыццё беларусаў у Чэхаславакіі, сярод якіх найбольш актыўна праявіла сябе студэнцкая моладзь. У 1923 г. пры Беларускай грамадзе быў арганізаваны Музыкальна-драматычны гурток, які ў 1924 г. пачаў называцца Драматычным гуртком пры Беларускай Радзе ў Празе. Аматарскі калектыў першым у Чэхаславакіі пачаў пастаноўку музыкальных спектакляў на беларускай мове.